■ З нагоды

## На скрыжаванні дарог

### Пасажыры мелі магчымасць падпісацца на «Звязду»

**Фестываль «Пошта і СМІ» стаў у Гродне традыцыйным і праводзіцца кожны квартал. Беларускія выданні з дапамогай работнікаў пошты атрымліваюць магчымасць напрамую кантактаваць з патэнцыйнымі падпісчыкамі, каб больш падрабязна расказаць чытачам аб сваіх часопісах і газетах.**

Як правіла, месца для правядзення фестывалю выбіраецца ажыўленае. Мерапрыемствы ўжо праходзілі на галоўнай плошчы горада — Савецкай, непасрэдна каля абласнога паштамта, у новым мікраёне Альшанка... На гэты раз фестываль раскінуў свае павільёны, што называецца, «на скрыжаванні дарог» — на тэрыторыі прывакзальнай плошчы каля аўтавакзала. І сапраўды, знайшлося нямала пасажыраў, якія мелі час перад пасадкай і скарысталі яго, каб пацікавіцца беларускімі выданнямі. «Звязда» таксама знайшла сваіх прыхільнікаў. У павільёне была прадстаўлена ўся выдавецкая дзейнасць — каля дзесяці газет і часопісаў Выдавецкага дома «Звязда». Кожны, хто аформіў падпіску, атрымаў прыемны сувенір. Сярод падарункаў — кубкі, майкі, бейсболкі, блакноты і нататнікі, магніты, календары і іншае. Ніхто з падпісчыкаў не застаўся без бонусу.

Нагадаем, што падпіска на «Звязду» працягваецца!

**Маргарыта УШКЕВІЧ**

# ГЕНЕРАЛЬНАЯ РЭПЕТЫЦЫЯ СВЯТА



**У Віцебску прайшлі дзясяткі цікавых мерапрыемстваў у межах святкавання Дня горада. Сталіцы міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар» споўнілася 1044 гады. Падчас «імянін», якія расцягнуліся на некалькі дзён, «фішак» было нямала.**

У мінулую суботу, напрыклад, прэзентавалі дзве скульптуры. Адну з іх — «Віцебскі волат» усталявалі ў скверы Маякоўскага, паміж сімвалам горада, ратушай і дырэкцыяй фестывалю. Прававобраз волата — Фёдар Махноў — нарадзіўся ў чэрвені 1878 года на хутары каля вёскі Касцюкі (на тэрыторыі Віцебскага раёна), памёр у 1912-м. Ёсць дакументальныя крыніцы, якія сведчаць, што ён быў вышынёй 2 метры 85 сантыметраў і важыў 180 кілаграмаў. Інфармацыя пра рост ёсць і на камені непадалёк ад скульптуры. Дарэчы, яна вышэйшая і складае 310 сантыметраў, бо волат з цыліндрам на галаве...

Яшчэ адной навінкай у гарадскім асяроддзі стала скульптура, якая сімвалізуе адну з трох рэк Віцебска — Лучосу. Паколькі ўвекавечылі яе ў вобразе німфы, якая ўзвышаецца на камені над хвалямі, жартаўнікі ўжо прыдумалі назву твору — «Віцебская русалка». Яе можна ўбачыць каля гатэля «Лучоса».

Кіраўніцтва гарвыканкама, прадстаўнікі дэлегацый гарадоўпабрацімаў прысутнічалі на цырымоніях адкрыцця скульптур, іншых мерапрыемствах. Прысутныя ацанілі крэатыўны творчы падыход арганізатараў прэзентацый.

У рамках трэцяга міжнароднага конкурсу — фестывалю фатаграфіі «ФотаКрок» адкрылі музей фатаграфіі імя Сігізмунда Юркоўскага, які 135 гадоў таму сканструяваў затвор. Ён працаваў у Віцебску, пры гэтым быў адным з самых вядомых фотамайстроў свайго часу. Фестываль з удзелам фатографаў з розных краін правялі пры падтрымцы дэпутатаў беларускага парламента. Падрабязнасці ў наступных нумарах «Звязды».

На святкаванні Дня горада-імянінніка многае нагадвала «Славянскі базар». У прыватнасці, стваралі добры настрой і ўдзельнікі фестывальнага праекта вулічнага мастацтва «На сямі вятрах». Нездарма Дзень горада ў Віцебску называюць «генеральнай рэпетыцыяй» самага маштабнага на постсавецкай прасторы фестывалю.

З раніцы да позняга вечара пад адкрытым небам працавалі кірмашы, гандлёвыя рады, арганізоўвалі вулічныя канцэрты і забаўляльныя праграмы.

Адбыліся пленэр юных мастакоў, выстаўка рэтра-аўто, вулічны паказ фільмаў, знятых у савецкі час, свята паэтаў і пісьменнікаў, конкурс паветраных змеяў, XXV Міжнародны турнір па інтэлектуальных гульнях «Кубак княгіні Вольгі» і многае іншае.

Усюды было шмат гледачоў. Напрыклад, на пляцоўцы, адведзенай аматарам гістарычнай рэканструкцыі, а таксама ў Летнім амфітэатры, дзе тысячы гараджан і гасцей горада ўбачылі традыцыйны святочны канцэрт.

Святочны феерверк, светлавое шоу ў суботу сталі цудоўным падарункам гораду і тым, хто яго любіць.

А ў нядзелю на плошчы Перамогі адбыўся «Дзень моладзі». У насычанай праграме, у ліку іншага, былі спартыўная зарадка «Запальвай, моладзь», конкурсны велапрабег, танцавальны марафон «Агонь танца» і «Бітва дыджэяў».

Для сямейнага адпачынку арганізавалі розныя мерапрыемствы ў парку імя Савецкай Арміі, заапарку, культурна-гістарычным комплексе «Залатое кальцо горада Віцебска «Дзвіна».

У святочныя дні можна было пракаціцца на экскурсійным трамваі, і па хвалях Заходняй Дзвіны — падчас цеплаходнага ваяжу





Фота Віктара НІКАЛАЕВА.

■ Напярэдадні фестывалю



# «Базар» здзівіць і сёлета

**Па традыцыі да міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» рыхтуюцца пасля завяршэння чарговага. І як бы ні спрабавалі скептыкі даказаць, што на «Базары» ўжо даўно «адныя паўторы», штогод ёсць чаму здзіўляцца. Бо заўсёды ёсць месца сюрпрызам. Сёлета афіцыйная частка самай маштабнай на тэрыторыі былога СССР культурнай акцыі пройдзе з 12 па 16 ліпеня.**

## Юбілейнае свята лялек

На «Базары» пройдзе пяты «Лялечны квартал» — міжнародны фестываль тэатраў лялек. Штогод гледачы маюць магчымасць пабачыць як спектаклі для дзяцей і дарослых на сцэне Беларускага тэатра «Лялька», так і разнастайныя вулічныя пастаноўкі і перформансы. Да ўдзелу запрашаюцца найцікавейшыя калектывы з краін блізкага і далёкага замежжа, здатныя спалучаць традыцыі з плённымі пошукамі ў рэчышчы сучаснага мастацтва. Арганізатары абяцаюць, што на юбілейным міні-фэсце будзе пашырана геаграфія ўдзельнікаў, стане больш тэатраў і пастановак.

Упершыню на «Базары» каля Летняга амфітэатра створаць «мабільны прэс-цэнтр». Два апошнія фестывалі рэпарцёры былі незадаволеныя: як раней, іх не пускалі ў закулісся галоўнай сцэнічнай пляцоўкі. Цяпер будзе магчымасць задаць пытанні зоркам, калі, канешне, яны захочуць пагутарыць з «акуламі, шчупакамі і карасямі пяра».

## Віцебскі... сакрэт!

Па традыцыі на фэсце конкурсы выканаўцаў у цэнтры ўвагі. Беларусь прадставіць 27-гадовы канкурсант з Мінска Яўген Курчыч.

Старшынёй журы XXVII Міжнароднага конкурсу выканаўцаў эстраднай песні «Віцебск-2018» будзе народны артыст Расійскай Федэрацыі, Малдовы і Украіны, кампазітар, аўтар-выканаўца Аляксандр Марозаў. Цікава, што ў ліку суддзяў заяўлены і знакаміты італьянскі спявак, прадзюсар, тэлевізійны вядучы Раберціна Ларэці.

А журы XVI Міжнароднага дзіцячага конкурсу ўзначаліць Канстанцін Масковіч, народны артыст Малдовы, музыкант, кампазітар. Гонар нашай краіны будзе адстойваць 12-гадовы Арцём Скароль з Ашмян.

Наконт зорак: на «Славянскім Базары» ўпершыню іх будзе некалькі. У прыватнасці, знакаміты рэжысёр, акцёр, музыкант Эмір Кустурыца выступіць у амфітэатры ў складзе No smoking orchestra. На фэсце адбудзецца паказ яго фільма «Па Млечным Шляху», у якім ён выканаў адну з галоўных роляў.

Раней не было на «Базары» гурта «Мумій Троль», куміра падлеткаў рэпера Цімаці. Шмат ахвотных стаць гледачамі начнога гумарыстычнага шоу з удзелам Аляксандра Рэвы і Міхаіла Галусцяна.

**Дырэктар міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» Аляксандр СІДАРЭНКА** абяцае, што па традыцыі будуць канцэрты, прэзентацыі праектаў, тэатральныя пастаноўкі на любы густ і для розных узростаў.

«Звязда» абавязкова раскажа пра самае цікавае. Хоць нецікавага на «Базары» няма. Штодня ў горадзе мноства мерапрыемстваў, у тым ліку і на плошчах, вуліцах — з раніцы да позняй ночы. А бывае, і да раніцы наступнага дня.

Як пасля бяссонных начэй гараджане ўмудраюцца з поўнымі сіламі ў добрым настроі працаваць, каб вечарам зноў на фэст? Гэта — «базарная тайна»!




Фота Віктара НІКАЛАЕВА.

**Матэрыялы падрыхтаваў Аляксандр ПУКШАНСКІ.**